Источник: **«Звязда» - 2012-02-28**

## Ці патрэбна сучаснай школе краязнаўства?

**Выкладаць факультатыў па краязнаўстве ў кожнай беларускай школе прапануе акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр КАВАЛЕНЯ. Пра тое, якім павінен быць гэты курс, мы і распыталі ў Аляксандра Аляксандравіча:**

— Гісторыка-культурная спадчына нашай краіны багатая і непаўторная. Нягледзячы на тое, што мы маем толькі 20 гадоў незалежнасці, у нас за плячыма больш чым тысячагадовая гісторыя. Нагадаю, у гэтым годзе Полацк будзе святкаваць 1150-годдзе з часу першага згадвання ў летапісе, а фактычна гэта 1150-годдзе з пачатку беларускай дзяржаўнасці. І беларусы павінны не проста мець веды пра сваю гісторыю і культуру — гэтыя веды павінны быць асэнсаванымі, каб чалавек унутрана адчуваў сваю прыналежнасць да лёсу беларускага народа. Без гэтага ўсе нашы веды — нішто. Нездарма старажытныя мудрацы вучылі: "Хто не памятае мінулага, асуджаны перажыць яго зноў". Таму, як мне падаецца, у кожным рэгіёне з улікам яго асаблівасцяў неабходна распрацаваць цікавыя факультатывы па краязнаўстве (ці радзімазнаўстве), праз змястоўна і прыгожа аформленыя дапаможнікі раскрыць гісторыю роднага горада ці вёскі. Можна і назвы адпаведныя прыдумаць, напрыклад, — "Пінсказнаўства", "Маладзечназнаўства" ці "Мая родная Капыльшчына".



Для стварэння такіх факультатываў у нас ёсць неабходны матэрыял: у першую чаргу гэта 146-томнае выданне кніг-хронік "Памяць", дзе ёсць звесткі па гісторыі кожнага раёна. Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі падрыхтавана выданне "Гарады і вёскі Беларусі", дзе сабраны багаты матэрыял, які можна выкарыстаць для правядзення такіх факультатываў. І я мяркую, што навукоўцам і метадыстам можна было б разам з органамі асветы падрыхтаваць спецыяльныя дапаможнікі.

**— Асноўная мэта стварэння такіх факультатываў — пашырэнне ведаў пра гісторыю? Ці фарміраванне патрыятызму?**

— Думаю, што гэтыя катэгорыі не трэба супрацьпастаўляць. Тут прысутнічае арганічнае двуадзінства. Трэба, каб кожны грамадзянін, пачынаючы з дзіцячага садка, школы, сям'і, фарміраваў пазітыўнае пачуццё Радзімы. Без гэтай асновы, калі такія пачуцці не сфарміраваліся ў чалавеку, калі ў яго няма ўнутранай патрэбы любові да маці, да дому, да родных, да сваіх мясцін — без гэтага ўсяго чалавек-асоба не зможа нікога іншага любіць.

Дарэчы, у нашай краіне ўжо зроблена нямала для фарміравання грамадзянскіх якасцяў падрастаючага пакалення — у прыватнасці, для першакласнікаў падрыхтаваны падручнік "Беларусь — наша Радзіма", а таксама створана спецыяльнае яго мультымедыйнае суправаджэнне, дзе з дапамогай сучасных тэхналогій выкладзена гісторыя краіны, паказаны славутыя асобы, святы, дзяржаўныя сімвалы, прырода, інфармацыя пра кожную вобласць і сталіцу краіны і г.д. І вось на гэтым падмурку неабходна развіваць тэму далей — расказваць

дзецям і пра іх малую Радзіму, пра тое месца, дзе яны нарадзіліся і жывуць. Хачу адзначыць, што падобныя факультатывы ўжо існуюць у многіх школах. Напрыклад, у школах выкладаюцца "Магілёвазнаўства", "Гістарычнае краязнаўства Магілёўшчыны", "Невядомыя старонкі Крычаўшчыны", "Хоцімшчына — край Прыбяседскі", "Слонімазнаўства", "Паставазнаўства", "Оршазнаўства", "Віцебсказнаўства" і г.д. У Беларусі, як ні ў адной іншай краіне СНД, створана вялікая колькасць школьных музеяў. А многія з іх з'яўляюцца проста ўзорнымі, дзе працуюць сапраўды апантаныя людзі, якія клапоцяцца аб захаванні нашай гісторыка-культурнай спадчыны — напрыклад, выдатны школьны музей у Любчы. Але трэба, каб такія музеі, такія факультатывы існавалі ў кожнай школе. Без гэтага нам будзе складана фарміраваць сапраўдныя грамадзянскія якасці асобы.

***— А вы не баіцеся, што такая ідэя і пачынанне пры масавым падыходзе можа ператварыцца ў фармалізм? Бо і так, калі ёсць зацікаўлены чалавек, то ў школе працуе музей, чытаецца факультатыў...***

— Сапраўды, тут патрэбна спалучэнне і пэўнай дзяржаўнай пазіцыі, і наяўнасць зацікаўленых людзей. Калі гэта будзе "абязалаўка", то ідэя будзе зведзена ў нішто. Трэба, каб быў рух душы — без яго нічога не атрымаецца. Але пры гэтым не павінна быць і нейкай стыхіі — у гэтай справе неабходна пэўная дзяржаўная пазіцыя. Безумоўна, не жорсткая, але напрамак павінен быць зададзены, і факультатывы павінны падтрымлівацца органамі адукацыі. Для краіны, якая толькі 20 гадоў таму набыла сваю незалежнасць, гэта архіактуальная задача, бо ў іншых краінах ніхто не задаецца пытаннямі "Хто мы такія?" і "Адкуль мы?". Хіба ў паляка ці літоўца такое пытанне ўзнікне?..

***— Падтрымка павінна быць маральная ці матэрыяльная?***

— Магчыма, не столькі нават матэрыяльная... Людзей трэба адзначаць: тых, хто імкнецца з павагай ставіцца да нашага мінулага, захаваць гісторыка-культурную спадчыну... Мы не павінны баяцца маральных стымулаў. Хай усе ведаць, што чалавек робіць высакародную справу, накіраваную на папулярызацыю нашых дасягненняў. Вось гэтага сёння вельмі і вельмі не хапае — мы павінны гаварыць добра пра людзей не толькі тады, калі яны адыходзяць, мы павінны казаць гэта сёння жывым людзям. Але, натуральна, патрэбна і матэрыяльная падтрымка — кожную працу трэба матэрыяльна стымуляваць.

***— Вы лічыце форму факультатыва найбольш удалай, або можна, напрыклад, пашырыць курс гісторыі, уключыўшы туды раздзел аб краязнаўстве?***

— Краязнаўства павінна стаць арганічным працягам айчыннай і сусветнай гісторыі. Праз асэнсаванне сябе, свайго вопыту, сваіх нацыянальных традыцый мы бачым, як наогул з'явіўся першы чалавек на Беларусі, мы пазнаем, хто мы такія, на што мы здольныя і гэтак далей. Гэта не можа быць нейкімі асобна разарванымі кавалкамі — краязнаўства павінна быць яшчэ адной прыступкай у вывучэнні нашай Радзімы і сусветнай гісторыі ў цэлым. І не трэба абмяжоўвацца толькі факультатывам — варта пашыраць практыку паходаў з дзецьмі. Бо гэты вопыт застаецца ў памяці на ўсё жыццё: дзе яны начавалі, што ўбачылі, што фатаграфавалі. Да таго ж сёння ёсць і ўсе сродкі — і лічбавыя фотаапараты, і відэакамеры: школьнік можа зафіксаваць гэтыя імгненні, а потым, праз шмат гадоў, сваім дзецям паказаць: "Паглядзі, сын, як я рабіў!". І наступныя пакаленні, бачачы гэты вопыт, будуць імкнуцца зрабіць гэтак жа, а то і лепей. Але, безумоўна, нельга ўсіх заганяць у жорсткія рамкі — гэта павінна быць творчасць душы.

***— Вы сказалі, што практычны матэрыял ёсць — і кнігі "Памяць", і іншыя выданні. Але ці знойдуцца таленавітыя людзі, у тым ліку на месцах, якія змогуць гэты матэрыял перапрацаваць і цікава дзецям падаць?***

— Дыдактычныя і метадычныя матэрыялы, вядома, трэба рыхтаваць. Зразумела, што аднаму чалавеку, простаму настаўніку гэта будзе складана зрабіць. Неабходна, каб да справы падключаліся навукоўцы Інстытута гісторыі і Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, Нацыянальны інстытут адукацыі, кафедры рэгіянальных ВНУ. Гэтыя ўстановы, пры падтрымцы мясцовых органаў улады, павінны аказаць неабходную метадычную падтрымку настаўнікам. Каардынуючая роля — вядома, за Міністэрствам адукацыі.

А што тычыцца людзей, у якіх блішчаць вочы, якія дбаюць аб нашай гісторыі — то ў нас такіх настаўнікаў шмат. Дарэчы, хачу адзначыць, што ідэя наконт пашырэння вывучэння краязнаўства нарадзілася не ў мяне аднаго — у 2010 годзе ў Алеся Карлюкевіча, галоўнага рэдактара "Звязды", выйшла кніга пад назвай "Радзімазнаўства", у якой шмат цікавых замалёвак пра гарады, мясціны, пра людзей Беларусі. Падобных прац у нас яшчэ мала.

...Што такое патрыятызм? Гэта не толькі найбольш важная ўмова выжывання народаў і вырашальны маральны фактар паспяховага пераадолення цяжкасцяў, але і магутны духоўны сродак для забеспячэння сацыяльна-эканамічнага развіцця, захавання і памнажэння духоўных каштоўнасцяў народаў.

***— Пастаянна ідзе размова пра тое, што школьнікі вельмі загружаны вучобай і неабходна скарачаць гадзіны на тыя ці іншыя прадметы. Ці не выклікае ініцыятыва стварэння новага факультатыва негатыўнай рэакцыі з боку бацькоў?***

— Ведаеце, я наогул лічу, што вучоба — гэта самая цяжкая праца. Яна не можа быць лёгкай. І мне здаецца, вучобу нельга ператвараць у гульню — здабываць веды трэба асэнсавана, затрачваючы неабходную інтэлектуальную энергію. Не трэба прымушаць дзяцей завучваць, бо калі мы "заганяем" у галовы даты і падзеі, яны не разумеюць сувязь гэтых падзей. Веды павінны быць асэнсаванымі, тады вучыцца лёгка.

Што тычыцца факультатыва, то яго нельга ўводзіць прымусова. Нельга прымусіць любіць. Але яшчэ раз паўтару — пры гэтым павінна быць дзяржаўная ідэя, дзяржаўная пазіцыя: кожны грамадзянін мусіць ведаць гісторыю сваёй дзяржаўнасці, культуры, веравызнання, мовы — без гэтага духоўнага стрыжня няма чалавека. Мы можам вырасціць адукаванага чалавека, але калі ў яго не будзе любові да бліжняга, дык гэта будзе высокаадукаваны прайдзісвет і хапуга, здольны выкарыстоўваць атрыманыя веды толькі дзеля асабістай выгады. Краязнаўства ставіць мэтай убачыць тых людзей, якія жылі да цябе — адны адстойвалі Радзіму, другія будавалі калгасы, трэція рабілі памылкі і разбуралі цэрквы, іншыя — станавіліся настаўнікамі, вучонымі і г.д. І толькі на аснове гэтага можна прывіць чалавеку любоў да сям'і і Радзімы.

*Гутарыў Павел БЕРАСНЕЎ*

*Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ*